Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 9 (28625)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«Маладое» жыллё падаражэла
СТАР. 4

Беларускі Народны каляндар на 2018 год
СТАР. 8–9

Куды рушыць дзяржава трох кантынентаў
СТАР. 11

ЛІЧБА ДНЯ

79,2

тысячы замежных грамадзян прыехалі ў Беларусь па бязвізавым рэжыме з пачатку яго дзеяння і да канца 2017 года, паведамілі ў Дзяржаўным памежным камітэце. Часцей за ўсё беларускім бязвізам карысталіся грамадзяне Германіі — 12,7 тыс. чалавек, Польшчы (каля 7,6 тыс.) і Італіі (больш за 6,7 тыс.). Усяго ў 2017 годзе без віз у Беларусь уехалі грамадзяне 65 краін, сярод якіх і такія экзатычныя, як Панама, Нікарагуа, Антыгуа і Барбуда. Указ Прэзідэнта № 8 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян» пачаў дзейнічаць у Беларусі 12 лютага 2017 года. Дакументам устанаўліваецца бязвізавы парадак уезду ў Беларусь на тэрмін не больш за 5 сутак пры ўездзе праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.01.2018 г.

Долар ЗША	2,0048	▼
Еўра	2,4202	▲
Рас. руб.	0,0353	▼
Укр. грыўня	0,0702	▼

ISSN 1990 - 763X

ДЗІВОСЫ ЗІМНЯГА САДУ

Фота БЕЛТА.

У аранжарэі аграсядзібы «Абузер'е» Чашніцкага раёна растуць бананы, апельсіны, лімоны і іншыя экзатычныя для нашых шырот расліны. На дварэ добры мароз, а гаспадыня дзівоснага саду Ларыса ІВАНОВА збірае ўраджай цытрусавых.

■ Тэхналогіі ў дапамогу

РАЗЛІЧВАЦЦА ЗА «КАМУНАЛКУ» СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Безнаяўныя субсідыі, зваротныя плацяжы і дэталізаваная інфармацыя пра паслугі

Асабісты кабінет карыстальніка, QR-код пры разліку за паслугі і іншыя сэрвісы абяцаюць запусціць сёлета ў сістэме АРІП. У прыватнасці, плануецца ўкараніць праграмны комплекс, які дазволіць атрымліваць разнастайныя даныя з аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы разліку за жыллёва-камунальныя паслугі (АІС «Разлік-ЖКП»). Напрыклад, фарміраваць «нестандартныя» справаздачы для ЖКГ і пастаўшчыкоў паслуг з улікам іх патрэбнасцяў. Падрабязнасці новаўвядзенняў «Звяздзе» растлумачылі спецыялісты.

Сэрвісы для кліентаў

Да сістэмы АРІП падключана ўжо 62 тысячы паслуг, якія аказваюць больш за 14 тысяч вытворцаў, у тым ліку 203 арганізацыі, якія працуюць з АІС «Разлік-ЖКП», і гэты пералік з часам павялічваецца, як і колькасць сэрвісаў, што прапануе праграма.

— Сістэма АРІП, якая дзейнічае ў Беларусі ўжо 10 гадоў, — гэта абсалютна новае пачынанне, якога няма нідзе на постсавецкай прасторы. А перспектывы развіцця АІС «Разлік-ЖКП» бязмежныя, — заўважыў **Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ, намеснік начальніка аддзела білінгавых сістэм ААТ «НКФА «АРІП».** — Адным з прыярытэтных кірункаў нашай работы ў 2018—2019 гадах стане развіццё кліенцкіх сэрвісаў.

Асабісты кабінет, які з'явіцца прыкладна летам гэтага года, дазволіць карыстальнікам атрымліваць дэталізаваную інфармацыю пра спажытыя паслугі. Спачатку пра камунальныя, а пасля і пра іншыя. Можна будзе ўбачыць патрабаванні на аплату і паведамленне пра іх наяўнасць, а таксама кіраваць інфармацыяй пра спажытыя паслугі. Акрамя таго, у АРІП мяркуюць даць карыстальнікам магчымасць атрымліваць інфармацыю пра запазычанасць перад арганізацыямі, што налічваюць камунальную плату, аказваюць паслугі сувязі, крэдытнымі органамі.

СТАР. 4

■ Побач з намі

СОННАЯ ПАРАЧКА І ЗЕМЛЯНЫ ВОЎК

У Гродзенскім заапарку з'явіліся экзатычныя віды жывёл

Навасёламі сталі трубказубы і некалькі відаў гіен. Усе жывёлы лічацца рэдкімі, і не кожны заапарк можа пахваліцца такімі насельнікамі. Асабліва цікава выглядаюць трубказубы, якія маюць свіны лычык, заячыя вушы, хвост кенгуру і лапы мурашкаеда.

Разварушыць такіх лежабокаў няпроста. Каб зрабіць здымак, **намесніку дырэктара заапарка Віталю ГУМЕННАМУ** нават прыйшлося пацягаць аднаго з іх за хвост. Толькі тады яны падняліся і мірна паазіраліся вакол. У гэты момант і ўдалося зрабіць некалькі здымкаў (гл. фота на 5-й стар.), пасля чаго парачка трубказубаў зноў прымасцілася адзін каля аднаго.

СТАР. 5

НАГОДА ДЛЯ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ

Прэзідэнт правёў традыцыйны прыём напярэдадні старога Новага года

Мароз і святочны настрой трымаліся ўчора. Важны падарунак — дзяржаўныя ўзнагароды — атрымалі прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і творчай інтэлігенцыі. На традыцыйным мерапрыемстве, якое адбываецца ў канцы навагодніх свят, Аляксандр Лукашэнка пажадаў прысутным вялікіх поспехаў у гэтым годзе.

На цырымонію былі запрошаныя журналісты, работнікі культуры, спорту і дзяржаўныя служачыя. Прэзідэнт падзякаваў ім за працу ў мінулым годзе і настроіў на далейшыя дасягненні, адзначыўшы, што сёння мы жывём у няпросты час: «Вы бачыце, як развіваецца наша краіна, як развіваецца свет. Вы бачыце тое становішча, якое мы займаем у гэтым бурным свеце, які вельмі хутка мяняецца. І самае страшнае, што ў нас няма ніякай магчымасці адгарадзіцца ад усіх негатыўных працэсаў. Трэба ўмець гэтым працэсам супрацьстаяць». «Мы павінны навучыцца жыць у гэтым свеце, дзе трэба прыстасоўвацца, але ні ў якім разе не згубіць сваю ідэнтычнасць, тыя карані, ад якіх расце наша беларуская нацыя», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што лёгка не будзе, але амбіцыйныя задачы, якія паставілі перад сабой беларусы, неабходна вырашыць.

У зале сабраліся вядомыя прадстаўнікі творчых колаў. Публічнасць — гэта адказнасць, неабходна быць узорам для пераймання. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што супрацоўнікі тэлебачання, культуры і мастацтва, спартсмены могуць ствараць моду на здаровы лад жыцця і глыбокія веды, фарміраваць пачуццё гонару за свой народ.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэн Францыска Скарыны дырэктару Нацыянальнага прадстаўніцтва міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі Уладзіміру Пярцову, медаль Францыска Скарыны — загадчыцы аддзела палітычных аглядальнікаў галоўнай дырэкцыі АТН Вользе Макей. Шэрагу журналістаў былі аб'яўлены Падзякі Прэзідэнта. Аляксандр Саладуха ўчора атрымаў ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» за значны ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускага эстраднага мастацтва.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

■ Дата

Чатыры вобласці святкуюць юбілей

15 студзеня 1938 года (80 гадоў таму) першая сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла пастанову «Аб змяненні і дапаўненні артыкулаў Канстытуцыі СССР «Аб увядзенні ў БССР абласнога адміністрацыйнага дзялення».

У Беларусі былі створаны першыя вобласці: Віцебская, Гомельская, Мінская, Магілёўская і Палеская (існавала да 1954 года). Да гэтага тэрыторыя рэспублікі падзялялася на губерні, а з 1924 года — на акругі.

Аб тым, з якімі дасягненнямі прыйшлі чатыры вобласці краіны да свайго юбілею, мы раскажам у наступным нумары «Звязды».

■ Будзь у курсе!

«БЕЛАВІЯ» ПАЧНЕ ВЫКОНВАЦЬ ПАЛЁТЫ Ў КАЗАНЬ

26 красавіка «Белавія» пачне выконваць рэйсы па маршруце Мінск — Казань — Мінск, паведамілі ў авіякампаніі.

Палёты будуць ажыццяўляцца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з Мінска ў 23.50 па аўторках, чацвяргах, пятніцах і нядзелях і прыбыццём у Міжнародны аэрапорт «Казань» на наступны дзень у 2.10. Зваротны рэйс са сталіцы Татарстана плануецца ажыццяўляць з вылетам у 4.30 па панядзелках, серадах, пятніцах і суботах з прылётам у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 6.50. Час для ўсіх аэрапортаў названы мясцовы.

Палёты плануецца ажыццяўляць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175 пасажыраўмяшчальнасцю 76 месцаў. Час у шляху складзе каля 2 гадзін 20 хвілін. Кошт авіябілетаў пры куплі на сайце belavia.by у адзін бок складзе ад 106 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 199 еўра — туды-назад. Яны ўжо даступныя ў продажы.

Таксама маршрут Мінск — Казань — Мінск будзе зручны для выканання транзітных пералётаў паміж Еўропай, Расіяй і краінамі Цэнтральнай Азіі. Напрыклад, для руху транзітам праз Мінск у Лондан, Рым, Барселону, Амстэрдам, Брусель, Варшаву і г. д. Такім чынам, прамы рэйс з Казані ў Мінск адкрывае для пасажыраў казанскага аэрапорта новыя магчымасці для падарожжаў.

ТАЛОНЫ НА ПРАЕЗД ЗМЕНЯЦЬ ДЫЗАЙН

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» з лютага пачне выпускаць талоны новага дызайну з дадатковай абаронай ад падробак.

Новыя білеты па сваім дызайне будуць не моцна адрознівацца ад папярэдніх, хіба па колеры стануць ярчэйшыя. Паводле інфармацыі прадпрыемства, асноўныя змяненні ў тым, што талоны сталі гарызантальнымі, а таксама цяпер у іх з абодвух бакоў будуць белыя палі для адзнакі кампосцера. З лютага пачнуць паступаць талоны з новым дызайнам, і па меры з'яўлення заявак ад кропак рэалізацыі яны будуць паступаць у абарот. Прычым паралельна будуць дзейнічаць і талоны папярэдняга дызайну. Паколькі гаворка ідзе толькі пра знешнія змяненні, цана за білет застанецца ранейшая — 60 капеек у касе, 65 — у кіроўцы і адпаведна 75 і 80 капеек — за праезд у экспрэсе. Дызайн вырашылі памяняць, каб было зручней пасажырам: малюнкі на новых узорах больш выразныя, адбітак кампосцера таксама атрымліваецца больш яркі. А паколькі белае поле маецца з абодвух бакоў, не трэба будзе думаць, як прабіваць талон. Дадатковая ступень абароны ўнутры квітка, паводле слоў спецыялістаў, гэта апраўданая мера, паколькі прадпрыемству даводзілася сутыкацца з выпадкамі падробкі талонаў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Выбары-2018

КАМПАНІЯ — У ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ

Па выніках вылучэння на мясцовых выбарах безальтэрнатыўных акруг няма ў Мінску і Магілёўскай вобласці

Аб гэтым заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА на спецыяльнай прэс-канферэнцыі.

«Мы пакуль не ведаем цалкам па краіне колькасць безальтэрнатыўных акруг. На жаль, у нас ёсць безальтэрнатыўныя акругі нават у абласныя Саветы. Няма ніводнай толькі ў горадзе Мінску і ў Магілёўскай вобласці», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Што датычыцца статыстычных даных, то ў Мінску на адну акругу ў сярэднім прэтэндуюць больш за шэсць чалавек, тады як у абласных Саветах у сярэднім па Беларусі конкурс складае 2,4 чалавека на месца. Дарэчы, самая вялікая выбарчая акруга ў сталіцы — Каменнагорская, у ёй на адно месца прэтэндуюць 10 чалавек.

Лідзія Ярмошына назвала і дакладную колькасць прэтэндэнтаў, якія вылучыліся на выбары, — яна складае 22 тысячы 719 чалавек. І гэта нягледзячы на той факт, што паступіла большая колькасць дакументаў, паколькі многія вылучаліся рознымі спосабамі, дадала яна. Калі параўнаць з 2014 годам, то тады вылучэнцаў было крыху больш — 22 тысячы 784, але гэта не павінна ўводзіць у зман, паколькі цяпер колькасць выбарчых акруг зменшылася больш чым на 700. Такім чынам, у працэнтных суадносінах колькасць кандыдатаў узрасла.

Дарэчы, сярод вылучэнцаў ёсць і 32 грамадзяніны Расіі, а больш за 45 % удзельнікаў — гэта дэпутаты дзеючага склікання. Грамадзянамі шляхам збору подпісаў вылучана 68,62 % кандыдатаў, працоўнымі калектывамі — 27,26 %, палітычнымі партыямі — 4,12 %. Каля 30 % кандыдатаў — гэта работнікі сферы адукацыі, культуры і навукі, 11 % — супрацоўнікі дзяржаўных органаў, больш за 4 % — гэта людзі, занятыя ў гандлі і сферы бытавога абслугоўвання, больш за 3 % — гэта супрацоўнікі праваахоўных органаў, ваенныя і крыху больш за 2 % — прадпрымальнікі.

Акрамя таго, старшыня Цэнтрвыбаркама расказала, хто вылучыўся на мясцовыя выбары па Мінску. Напрыклад, у сталіцы балатуюцца два дырэктары кінатэатраў — «Салют» і «Камсамолец», два памочнікі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, чатыры студэнты вышэйшых навучальных устаноў, а таксама два адвакаты.

Сярод тых, хто падаў дакументы, яна назвала старшыню Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, прарэктара па вучэбнай рабоце БНТУ, генеральнага дырэктара Нацыянальнага аэрапорта Мінск, экс-кандыдата на апошніх прэзідэнцкіх выбарах, галоўнага ўрача 36-й паліклінікі, дырэктара Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра і іншых — такім чынам, кола зацікаўленых людзей сапраўды шырокае.

Таксама Лідзія Ярмошына адзначыла, што ў ЦВК працягвае падаваць дакументы грамадзянін Беларусі, пенсіянер, які актыўна ўдзельнічае ва ўсіх выбарчых кампаніях, у тым ліку і прэзідэнцкіх, хоць статус кандыдата пакуль ім не быў атрыманы. Паводле яе слоў, гэты чалавек нядаўна адправіў заяву старшыні ЦВК Расіі Эле Памфілавай для рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Расійскай Федэрацыі.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СМІ: КАНСЕРВАТЫЎНЫ БЛОК МЕРКЕЛЬ І СДПГ ДАМОВІЛІСЯ АБ ФАРМІРАВАННІ КІРУЮЧАЙ КААЛІЦЫІ

Усе тры ўдзельнікі перагавораў аб фарміраванні кіруючай кааліцыі ў Германіі — кансерватыўны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС) і Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ) — узгаднілі праграмны дакумент, які павінен легчы ў аснову кааліцыйнага дагавора новага ўрада. Пра гэта паведамляе агенцтва DPA са спасылкай на ўдзельнікаў кансультацый.

Апошнімі 28-старонкавы дакумент зацвердзілі прадстаўнікі СДПГ. Раней у пятніцу праграма была падтрымана і кансерватыўным блокам Ангелы Меркель.

Як чакаецца, у найбліжэйшы час лідары трох партый выступяць з заявай для прэсы.

ЦАНА БАРЭЛЯ НАФТЫ МАРКІ BRENT ПЕРАВЫСІЛА 70 ДОЛАРАЎ

Цана нафты маркі Brent увечары 11 студзеня перавысіла адзнаку $70 за барэль упершыню за апошнія тры гады.

Фундаментальныя фактары спрыяюць нафтаваму рынку: узровень камерцыйных запасаў у Паўночнай Амерыцы зніжаецца на фоне пазітыўнай дынамікі загрузкі мясцовых НПЗ, а неспакой у сувязі з магчымым скарачэннем паставак сыравіны з Венесуэлы ўзрастае. У сераду Упраўленне энергетычнай інфармацыі ЗША прадставіла студзеньскую справаздачу, даныя якой разышліся з чаканнямі аналітыкаў. Камерцыйныя запасы ў ЗША знізіліся на 5 млн барэляў да 419,5 млн барэляў — гэта мінімум са жніўня 2015 года.

ТРАМП ЗАЯВІЎ, ШТО ВЕЛЬМІ ЗДЗІВІЦЦА, КАЛІ МЕДАГЛЯД ВЫЯВІЦЬ У ЯГО ПРАБЛЕМЫ СА ЗДАРОЎЕМ

«Я думаю, што ўсё пройдзе добра, — адзначыў ён, размаўляючы з журналістамі ў Белым доме. — Я вельмі здзіўлюся, калі нешта будзе не так». «Будзе лепш, калі ўсё пройдзе добра, інакш гэта разладзіць фондавыя біржы», — пажартаваў прэзідэнт. Яго выказванне распаўсюдзіў прэс-пул Белага дома.

Для Трампа, якому 14 чэрвеня споўніцца 72 гады, гэта першае медабследаванне ў якасці кіраўніка дзяржавы і галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі ЗША. Праводзіць яго будуць урачы Нацыянальнага медыцынскага цэнтра ВМС ЗША. Яны павінны будуць паставіць подпісы пад заключэннем аб тым, што стан здароўя Трампа дазваляе яму выконваць свае абавязкі да самага заканчэння тэрміну паўнамоцтваў.

Як паведаміў Белы дом, 16 студзеня асабісты доктар прэзідэнта Роні Джэксан раскажа журналістам больш падрабязна пра тое, як прайшоў медагляд.

Трамп не ўжывае спіртныя напоі і не курыць, любіць гуляць у гольф. Апошні раз ён публічна абмяркоўваў стан свайго здароўя ў верасні 2016 года, калі быў яшчэ кандыдатам у прэзідэнты. Тады ў адным інтэрв'ю ён сказаў, што прайшоў «усе медыцынскія тэсты» і ўзровень халестэрола ў яго «вельмі добры». Па словах прэзідэнта-мільярдэра, пры вазе прыкладна 107 кілаграмаў ён хацеў бы пахудзець на сем.

Фармат — прафесіяналізм

Інтэрнэт-прастора перамагае, але друкаваным СМІ заўсёды будзе чым зацікавіць чытачоў

Такую думку міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч выказаў падчас сустрэчы з будучымі журналістамі — студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Фармат зносін з чытачом можа быць розны: не толькі на паперы, але і ў сацыяльных сетках, адзначыў Аляксандр Карлюкевіч. Важна, каб любая рэдакцыя — ад вялікіх грамадска-палітычных газет да рэгіянальных — стала медыйным камунікацыйным цэнтрам для сваіх прыхільнікаў. Трэба рабіць крокі па рэфармаванні СМІ. Гэта датычыцца не толькі вонкавага выгляду, але і кантэнту выдання. Такая тэндэнцыя, дарэчы, пачынае фарміравацца. І будучым журналістам трэба знайсці сваё месца — блогера, фрылансера — у грамадскай, палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сферах.

— Галоўнае — авалодаць сучаснымі тэхналогіямі, — лічыць міністр. — Веды журналіст павінен шукаць і атрымліваць самастойна, у тым ліку і моўныя, а вось практычных семінараў з удзелам прафесійных журналістаў, на маю думку, недастаткова. Гэтаму павінна ўдзяляцца больш увагі ў навучальным працэсе.

І хоць асноўны спажывец інфармацыі, аналітыкі, іншых жанраў сёння арыентуецца на сусветнае сеціва, гэта не перашкаджае выпускаць і друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, аб чым сведчыць міжнародны вопыт. І ў нашай краіне выходзяць цікавыя газеты, якія займаюць сваю нішу ў грамадска-палітычнай інфармацыі, звязаны з аналітыкай эканамічнага характару, іншых надзённых пытанняў. Дзяржава падтрымлівае і друкаваныя, і электронныя СМІ. А папулярнасць выдання фарміруе ў першую чаргу прафесійны ўзровень журналістаў.

Такі ж падыход датычыцца і пісьменнікаў. У краіне выходзіць звыш 10 тысяч назваў кніг у год, таму пісьменнікам не варта скардзіцца на тое, што іх кнігі мала папулярызуюцца. Іх задача — ведаць жыццё, ведаць тое, пра што хочаш расказаць, і вучыцца, як гэта расказаць, падкрэсліў Аляксандр Карлюкевіч. У сваю чаргу, СМІ гатовы падтрымаць таленавітых аўтараў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

«АТЛЕТЫКА» — УЗНАГАРОДА ДЛЯ САМЫХ ЛЕПШЫХ

Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі падвяла вынікі 2017 года і ўзнагародзіла спартсменаў

Спецыяльная прэмія «Атлетыка» ўручаецца традыцыйна ў канцы сезона, ёю адзначаюцца атлеты і трэнеры, якія дамагліся найвышэйшага выніку.

«Медалі, якія беларускія атлеты заваявалі ў 2017-м, — залог будучыні нашага віду спорту. Усе праекты, якія праводзіла федэрацыя, прайшлі паспяхова. Летась у каралевы спорту былі не толькі паражэнні, але і нямала перамог, якія дазволяць дамагчыся больш значных вынікаў у будучыні», — адзначыў **старшыня федэрацыі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Па выніках мінулага года найлепшымі лёгкаатлетамі краіны прызнаныя Аліна Талай *(на фота)* (бег на 60 і 100 м з бар'ерамі) і кідальнік молата Павел Барэйша.

Найлепшым мужчынскім трэнерам стаў Сяргей Афанасьеў, найлепшым жаночым трэнерам — Валерый Аксянчук.

Сярод моладзі перамогу святкавалі Дзмітрый Набокаў (скачкі ў вышыню, чэмпіён Еўропы сярод моладзі) і Эльвіра Герман (бег з бар'ерамі, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод моладзі, сярэбраны прызёр Сусветнай універсіяды).

Найлепшымі лёгкаатлетамі ў катэгорыі «юніёры» сталі Максім Недасекаў: (скачкі ў вышыню, чэмпіён Еўропы сярод юніёраў) і Віялета Скварцова (трайны скачок, чэмпіёнка Еўропы сярод юніёраў, рэкардсменка Беларусі ў сваёй узроставай катэгорыі), якая таксама была ўдастоена намінацыі «Учынак года» за патрыятызм і павагу да дзяржаўнай сімволікі.

Федэрацыя лёгкай атлетыкі таксама заснавала спецыяльныя намінацыі:

«Прарыў года» — Павел Селівёрстаў (скачкі ў вышыню, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы ў закрытых памяшканнях).

«Характар года» — Крысціна Ціманоўская (сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод моладзі на дыстанцыі 100 м. 4-е месца чэмпіянату Еўропы сярод моладзі на дыстанцыі 200 м).

«Каманда года» — жаночая зборная, якая заваявала Кубак Еўропы ў бегу на 10 000 м (Вольга Мазуронак, Святлана Кудзеліч, Анастасія Іванова, Ніна Савіна, Людміла Ляховіч).

Адзначым, што акрамя статуэтак пераможцы атрымалі грашовыя сертыфікаты.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Кантрабанда

Вітаміны трапілі пад арышт

У Мсціслаўскім раёне мытнікі спынілі рух трох фур, якія везлі ў бок Расіі 56 тон свежай агародніны і садавіны без таварасуправаджальных дакументаў і фітасанітарных сертыфікатаў, якія пацвярджаюць бяспеку грузу.

— У грузавых адсеках гэтых машын знаходзілася амаль 18 тон турэцкіх гранатаў, больш за 19 тон памідораў і 19 тон польскіх груш адпаведна, — удакладнілі ў прэс-службе мытні.

Садавіна і агародніна агульным ацэначным коштам больш за 358 тысяч беларускіх рублёў канфіскаваныя. Па дадзеным факце супрацоўнікамі Магілёўскай мытні распачатыя адміністрацыйныя працэсы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■

ЗАТРЫМАЛІ ГРУПУ АЎТААФЕРЫСТАЎ

Яны інсцэніравалі ДТЗ, каб атрымаць страхоўку

Па матэрыялах ГУБАЗіК МУС заведзены крымінальныя справы ў дачыненні да членаў арганізаванай злачыннай групы, якія займаліся махлярствам у сферы аўтастрахавання.

Як паведамілі ў МУС, у ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў змагары з аргзлачыннасцю ўстанавілі, што зламыснікі за нібыта здзейсненыя ДТЗ атрымалі ад беларускіх страхавых кампаній выплаты на агульную суму больш за 118 тысяч рублёў.

У склад крымінальнай структуры ўваходзілі пяцёра мінчан ва ўзросце 27—44 гадоў. Двое з іх з'яўляліся ўладальнікамі аўтамабіляў Kia K'юрыс, застрахаваных па сістэме КАСКО. Яшчэ адзін такі ж седан прэміум-класа, але які пабываў у ДТЗ, аферысты набылі ў Расіі. «Бізнес» быў пастаўлены на паток: самыя дарагія непрыдатныя элементы з разбітага аўто перастаўляліся ў застрахаваныя, інсцэніраваліся аўтааварыі, пасля чаго паступала страхавое пакрыццё. З ліпеня 2016 года па кастрычнік 2017-га такую схему аферысты пракруцілі пяць разоў.

Па матэрыялах дзясятага ўпраўлення (па Мінскай вобласці) ГУБАЗіК МУС Рэспублікі Беларусь УСК Рэспублікі Беларусь па г. Мінску ў дачыненні да згаданых асоб распачатыя крымінальныя справы па артыкуле 209 КК Рэспублікі Беларусь (Махлярства). Падазраваныя былі затрыманыя і змешчаныя ў ІЧУ ГУУС Мінгарвыканкама.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ На слыху

НАЗВАНЫ ІМЁНЫ ФІНАЛІСТАЎ

11 удзельнікаў пазмагаюцца за пуцёўку на «Еўрабачанне» ад Беларусі

Увечары 11 студзеня па выніках адкрытага праслухоўвання, якое прайшло ў сценах Белтэлерадыёкампаніі, прафесійнае журы вызначыла фіналістаў нацыянальнага адборачнага тура міжнароднага конкурсу «Еўрабачанне».

Дарэчы, як адзначылі арганізатары, за працэсам адбору, які трансляваўся анлайн, толькі на афіцыйным сайце www.tvr.by сачылі 10 тысяч гледачоў, на YouTube-канале — у некалькі разоў больш. Судзейскай калегіі, у якую ўвайшлі прадстаўнікі медыяхолдынга, Міністэрства культуры, прафесіяналы ў розных галінах музыкі, а таксама журналісты, давялося праслухаць амаль 90 жывых выступленняў артыстаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Малдовы. У выніку ў шчаслівы спіс, які мог змяшчаць да 15 імёнаў, трапілі толькі 11 прэтэндэнтаў:

1. ALEN HIT (Алег Шчуцкі), «I don't care».
2. Квартэт «Adagio», «Ты і я».
3. Lexy (Аляксандра Ткач), «Ain't you».
4. Соф'я Лапіна, «Gravity».
5. Napoli (Вольга Шыманская), «Chasing rushes».
6. Alekseev, «Forever».
7. Анастасія Малашкевіч, «World on fire».
8. Гюнеш, «I won't cry».
9. Кірыл Гуд (Кірыл Ермакоў), «Deja Vu».
10. Гурт «Радыёхваля», «Subway lines».
11. Shuma, «Хмаркі».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Яшчэ да пачатку праслухоўвання беларускі адбор страсянула скандальная навіна аб тым, што адзін з канкурсантаў, украінскі поп-спявак Alekseev *(на фота),* можа быць дысквалiфікаваны за парушэнне рэгламенту. (Паводле правілаў, заяўленыя кампазіцыі не павінны быць камерцыйна рэалізаваны: праз інтэрнэт, ТБ, радыё, на канцэртах, апублікаваны на любых носьбітах, а таксама публічна выкананы да 1 верасня 2017 года. Рускамоўны ж варыянт песні Alekseev'a быў выкананы яшчэ ў маі мінулага года.) Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, праверка гэтых фактаў вядзецца, аднак да праслухоўвання артыст быў дапушчаны. Сам спявак, які прыехаў на адбор у ліку апошніх, растлумачыў, што канфлікту няма: на канцэртах гучаў толькі ўрывак песні з зусім іншым тэкстам і мелодыяй, «а кампазіцыя, якую мы заявілі на конкурс, упершыню прагучала толькі што ў студыі». Да фіналу нацыянальнага адбору сітуацыя мусіць канчаткова высветліцца.

Ужо ў наступны аўторак пройдзе лёсаванне, якое вызначыць парадак выступлення артыстаў у фінальным гала-канцэрце. Само шоу запланавана на 16 лютага. Яго пераможца — і прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні-2018» — будзе вызначаны галасаваннем журы і тэлегледачоў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. *tselyashuk@zviazda.by*

■

■ Здарэнне

Чаму не ўтрымала неба?

Ва Ушацкім раёне разбіўся пілот мотадэльтаплана

Па інфармацыі МНС, паведамленне пра падзенне лятальнага апарата на полі паблізу вёскі Лутава паступіла каля пяці гадзін вечара.

Ратавальнікі, якія прыбылі на месца трагедыі, убачылі дэльтаплан у полі на аддаленні каля 400 метраў ад населенага пункта. На месцы падзення было знойдзена цела мужчыны-пілота. Месца было ачэплена работнікамі РАУС, там пачалі працаваць следчыя і эксперты. Туды ж накіравалася перасоўная крыміналістычная лабараторыя.

Неўзабаве УСК па Віцебскай вобласці агучыла першую інфармацыю адносна здарэння. Было ўстаноўлена, што загінулым з'яўляецца 36-гадовы жыхар Полацка, індывідуальны прадпрымальнік. Ён нібыта з мэтай набыцця мотадэльтаплана, які належаў 26-гадоваму жыхару Полацка, прыехаў на нядзейную ўзлётна-пасадачную паласу паблізу вёскі Кублішчына Ушацкага раёна. Каб праверыць тэхнічныя характарыстыкі лятальнага апарата, ён здзейсніў узлёт на вышыню каля 50 метраў. Праляцеўшы каля кіламетра, мотадэльтаплан упаў на поле паміж вёскамі Лутава і Кублішчына. У выніку падзення пілот ад атрыманых цялесных пашкоджанняў сканаў на месцы.

Следчыя працягваюць работу на месцы здарэння: сабраны рэчавыя доказы, прызначана судова-медыцынская экспертыза. Да ўдзелу ў аглядзе месца трагедыі прыцягнуты супрацоўнікі дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

■ Рынак жылля

ПРАПАНОВА НА МІНІМУМЕ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Эксперты падлічылі, што калі 2016 год на другасным рынку жылля сталіцы запомніўся рэкордам па максімальнай колькасці зафіксаваных здзелак, то мінулы год устанавіў рэкорд па мінімуме пакінутых у продажы кватэр.

Нехта вырашыў і «прытрымаць»

Паспрабуем разабрацца, чаму гэта адбылося. Летась адзіным спакойным месяцам можна назваць толькі студзень, калі ў Мінску было прададзена нават менш за 700 кватэр. Але ўжо ў лютым гэты паказчык падняўся да 900 кватэр, а ў сакавіку пераваліў за адзнаку ў 1250 прададзеных жылых памяшканняў. У цэлым жа на працягу 2017 года сярэдняя колькасць здзейсненых здзелак знаходзілася на ўзроўні за 1100 прададзеных аб'ектаў у месяц, з якіх каля 10 % былі новабудоўлі.

У выніку такой актыўнасці на рынку з красавіка колькасць выстаўленых на продаж кватэр планамерна зніжалася. Больш за тое, восенню колькасць кватэр, прапанаваных на продаж, стала зніжацца проста рэкорднымі тэмпамі. Некаторыя прадаўцы, бачачы актыўны попыт і зніжэнне ставак па крэдытах, палічылі за лепшае «прытрымаць» кватэры ў надзеі на хуткае павышэнне коштаў. У выніку гэтага пачаў узнікаць невялікі, але ўсё ж аб'ём адкладзенай прапановы, які павінен выйсці ў продаж у 2018 годзе.

Зніжкі паменшыліся ўдвая

Вядома, што галоўным «актыватарам» у 2016-м для пакупнікоў выступалі малыя і застылыя на месцы цэны. А летась да іх дадаліся яшчэ і больш танныя крэдыты.

Па стане на канец снежня аб'ём памяшканняў на продаж складае прыкладна 5,7 тысячы кватэр, у той час як сярэдні ўзровень прапановы знаходзіцца на адзнацы каля 8 тысяч кватэр.

— Паводле нашых здзелках мы наглядна бачылі, што рынак у 2017 годзе прыкметна паскорыўся, — расказвае **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА.** — І пакупнікі, і прадаўцы хацелі вырашаць сваё жыллёвае пытанне максімальна аператыўна — у фармаце «тут і цяпер». Да таго ж большая частка прадаўцоў была яшчэ і пакупнікамі: пасля продажу наяўнай кватэры яны хацелі набыць іншую — больш прасторную або новабудоўлю.

Каб задаволіць усе патрэбы пакупнікоў і прадаўцоў, агенцтвы заключылі партнёрскія пагадненні з большасцю банкаў, навучылі ўласных спецыялістаў па крэдытаванні і распрацавалі спецыяльныя праграмы аказання паслуг: «Пераязджаем у новабудоўлю», «Пашыраем жылплошчу», «Пакупнікам з рэгіёнаў» і інш.

Дзякуючы гэтаму павялічылася доля здзелак, завершаных на працягу двух тыдняў, а сярэдні тэрмін продажу/куплі кватэры знізіўся з 35 дзён у 2016 годзе да 28 дзён летась. Але ёсць і не зусім добрая навіна для пакупнікоў. Так, сярэдняя велічыня зніжкі, якая даецца прадаўцамі па патрабаванні пакупнікоў, знізілася з 10 % у 2016 годзе да менш чым 5 % летась. Мінулы год наглядна прадэманстраваў, як на рынак жылля ўплываюць даступныя крэдыты. У выніку да канца мінулага года ў продажы застаўся рэкордна нізкі для апошніх трох гадоў аб'ём кватэр. Па стане на канец снежня ён складае прыкладна 5,7 тысячы кватэр, у той час як сярэдні ўзровень прапановы знаходзіцца на адзнацы каля 8 тысяч кватэр.

Значна падаражэла толькі «маладое» жыллё

Рост узроўню попыту, зніжэнне аб'ёму прапановы — усё гэта пры актыўнай крэдытнай падтрымцы не магло не адбіцца на цэнах. Аднак адсутнасць росту рэальных даходаў насельніцтва і эканамічнага аптымізму не дазволілі цэнам летась істотна вырасці.

Відавочна, што мацней за астатнія падаражэлі аднапакаёвыя кватэры. Квадратны метр тут за год падаражэў на 50 долараў.

Кватэры другаснага рынку вельмі неаднастайныя па сваіх якасных характарыстыках, таму і кошты на розныя тыпы жылля паводзілі сябе ў мінулым годзе па-рознаму. Самы істотны рост адзначаны на кватэры ў свежых (маладзейшых за 2009 год пабудовы) каркасна-блочных дамах — толькі ў жніўні і лістападзе жыллё тут даражэла на 3 % штомесяц. Такая высокая дынаміка цэн шмат у чым абумоўлена ростам цэн на каркасна-блокавыя новабудоўлі — прадаўцы аб'ектаў другаснага рынку часцяком арыентуюцца на іх.

Зваротная рэакцыя ад попыту не прымусіла сябе чакаць — у выніку росту цэн восенню папулярнасць кватэр у падобных каркасна-блочных дамах стала падаць, і ўжо ў лістападзе было набыта на 8 % менш такіх кватэр. Пакупнікі перавялі ўвагу на стабільныя па цане панэльныя дамы, рост коштаў у гэтым сегменце нязначны — у межах 3 % за год.

Плануецца мінімальны рост

Спробы падняць у 2018 годзе кошты на фоне адсутнасці росту даходаў пачнуць больш істотна ссоўваць фокус попыту ў бок бюджэтных, маламетражных кватэр і кватэр хрушчоўска-брэжнеўскай эпохі. У той час як цяпер такія разглядаюцца пакупнікамі ў апошнюю чаргу і толькі з-за іх мінімальнай плошчы, а значыць, і цэн.

Сёлета ў студзені чакаецца сезоннае зніжэнне попыту, аднак наяўнасць крэдытаў, хай яны крыху і выраслі ў кошце за снежань адыходзячага года, павінна ўтрымаць цэны на цяперашнім узроўні. Аднак крэдыты будуць толькі кампенсаваць недахоп сродкаў, а не выступаць прычынай росту цэн. У прыватнасці, крэдыты будуць працягваць дапамагаць тым пакупнікам, хто хоча пашырыць жылплошчу за кошт продажу наяўнай кватэры — бо ў гэтым выпадку крэдыт бярэцца толькі на даплату. Акрамя таго, крэдыты будуць запатрабаваныя пры куплі малагабарытных кватэр з мінімальным коштам. Вось гэты баланс уласных сродкаў пакупнікоў і даступных пазыковых сродкаў дазволіць цэнам сёлета знаходзіцца на досыць стабільным узроўні толькі з нязначным павелічэннем у параўнанні з бягучым узроўнем (не больш 2-4 %).

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

РАЗЛІЧВАЦЦА ЗА «КАМУНАЛКУ» СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Плацежныя выявы на прадметах

Каб ісці ў нагу з інфармацыйнымі тэхналогіямі і павысіць якасць абслугоўвання плацельшчыкаў, пазабанкаўская арганізацыя АРІП распрацавала тэхналогію, якая дазваляе выкарыстоўваць QR-код пры аплаце паслуг, вытворцы якіх падключаны да сістэмы АІС «Разлік».

— Зацверджаны стандарт для генерацыі QR-кода вытворцам паслуг і магчымасці яго счытвання ў мабільных праграмах банкаў і іншых пунктах здзяйснення плацяжоў. Апісанне фармату QR-кода размешчана на сайце raschet.by, — пракаментавалі новаўвядзенне спецыялісты АРІП. — Вытворца паслуг проста на сайце ў хуткім часе можа згенерыраваць QR-код у выглядзе невялікай выявы і нанесці яго на любы прадмет: паведамленне пра аплату, панэль у таксі, стойку адміністратара ў салоне і іншыя зручныя дэталі. Ніякіх грошай з вытворцаў за генерацыю кода не возьмуць, а плацельшчыкам не трэба будзе шукаць паслугу ў дрэве АРІП.

Разлічыцца з дапамогай QR-кода досыць проста. Чалавеку дастаткова камерай мабільнага тэлефона прасканіраваць QR-код — і ён трапіць на паслугу, якую збіраецца аплаціць, аўтаматычна. Пасля трэба ўвесці даныя і здзейсніць аперацыю. Спецыялісты разлічваюць, што банкі дапрацуюць свае мабільныя праграмы для спрошчанай аплаты праз АРІП, а вытворцы паслуг будуць гатовыя скарыстацца новай тэхналогіяй, тым самым павялічваючы якасць абслугоўвання плацельшчыкаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыносіць даведкі не трэба

Адна з функцый АІС «Разлік-ЖКП», якая ўжо працуе, — магчымасць налічэння безнаяўных жыллёвых субсідый для частковай аплаты ЖКП па выяўляльным прынцыпе грамадзянам, якія знаходзяцца ў складаным сацыяльным становішчы.

— Людзям не трэба збіраць і прыносіць даведкі пра сваё матэрыяльнае становішча — сістэма сама выявіць чалавека, у якога даход ніжэйшы. Ім адразу налічваюць субсідыі, і гэта бачна ў жыроўках, — пракаменціраваў магчымасці праграмы **Генадзь ТРУБІЛА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** — За 9 месяцаў мінулага года ў краіне субсідзіравана 426 010,5 рубля. У сталіцы па выяўляльным прынцыпе выдадзена субсідый на 41 989,9 рубля, па заяўным (калі чалавек сам звяртаецца па субсідыі) — 11 710,5 рубля.

Людзі, якім адразу налічваюць субсідыі на аплату «камуналкі» па выяўляльным прынцыпе, — гэта пенсіянеры, якія пражываюць асобна, і маладыя непрацуючыя інваліды. З часам гэтую катэгорыю плануецца пашырыць, аднак адпаведнае рашэнне пакуль не прынятае.

Па выяўляльным прынцыпе праграма прымае ў разлік даход сям'і за тры месяцы, а па заяўным — улічваецца заробак за паўгода да моманту звароту па дапамогу. На такі ж тэрмін адпаведна даюцца і безнаяўныя жыллёвыя субсідыі.

Уменне сістэмы АРІП весці і абнаўляць базу грамадзян у рэжыме рэальнага часу таксама спрыяе выяўленню катэгорый людзей, якія маюць патрэбу, дадалі ў НКФА «АРІП».

Спачатку ў нябанкаўскай арганізацыі было каля 30 % асабістых і ідэнтыфікацыйных нумароў пашпартоў людзей. Цяпер іх 99 %. Прывязка да пашпартоў дазваляе АРІП інтэгравацца з іншымі сістэмамі і атрымліваць неабходную для налічэння безнаяўных жыллёвых субсідый інфармацыю: звесткі пра заработную плату, пенсіі, дапамогі.

— Арганізаваць сістэму безнаяўных субсідый кожны разліковадаведачны цэнтр не ў стане, бо сістэма атрымання персанальных даных складаная, — заўважыў Аляксандр Селязнёў. — Нам аўтаматычна прыходзяць звесткі пра чалавека з вялікай колькасці дзяржаўных органаў: Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Фонду сацыяльнай аховы насельніцтва, Белдзяржстраха, Нацыянальнага кадастравага агенцтва. Пералік ведамстваў, якія дасылаюць інфармацыю ў НКФА «АРІП», а таксама межы і паўната падаваемых звестак вызначаны пастанаўленнем Саўміна № 790.

Пільнасць не перашкодзіць

Адна з добрых магчымасцяў праграмы — сістэма зваротных плацяжоў, якая дазваляе атрымаць свае грошы назад, калі пры аплаце няправільна ўвялі лічбы.

— Вельмі лёгка пераблытаць і націснуць, скажам, лішні нуль, калі плаціш праз банкамат. Асабліва гэта датычыцца пенсіянераў, для якіх нават невялікія сумы могуць быць даволі значнымі, — упэўнены спецыялісты. — Толькі за кастрычнік 2017-га вернута 83 плацяжы на суму 21 127 рублёў.

Спецыялісты НКФА «АРІП» папярэджваюць, што няправільны плацеж лепш за ўсё прадухіліць, пераправерыўшы інфармацыю на стадыі яе ўвядзення. Калі ж памылка-такі здарылася, адмяніць плацеж і вярнуць грошы можна ў банку да прыходу наступнага пасля аплаты дня. Прычым магчыма гэта ў дачыненні толькі тых вытворцаў паслуг, якія далі дазвол на такія аперацыі. У выпадку з электроннымі грашыма, браніраваннем электроннай чаргі, фотафіксацыяй хуткасці вярнуць сродкі праз банк не ўдасца — прыйдзецца ехаць непасрэдна ў кампанію і вырашаць пытанне. Як і з астатнімі вытворцамі паслуг, якія забаранілі банку вяртаць свае аплаты. Самі спецыялісты АРІП плацяжы не адмяняюць.

Такім чынам, якімі б зручнымі, аўтаматычнымі і «разумнымі» ні былі сэрвісы, чалавечая пільнасць і ўважлівасць лішнія не будуць.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

■ Грошы

Што патаннела больш за ўсё за год?

Мінулы год цалкам можа прэтэндаваць на званне года рэкордна нізкіх коштаў. Так, паводле афіцыйнай статыстыкі, інфляцыя ў снежні склала 4,6 %. Год таму гэты паказчык быў 10,6 %, два гады таму — 12 %. Аднак да нармальнай сітуацыі, калі цэны рэдка растуць хутчэй чым на 1,5 %, нам яшчэ далёка. Праўда, на пэўныя тавары кошты ў нас нават апусціліся.

АД ПЛАШЧА ДА ЧАСНАКУ

У дзясятцы рэйтынга самых патаннелых тавараў значыцца плашч (мінус 7 %), касцюм паўшарсцяны або сінтэтычны (-8 %), паліто дэмісезоннае (-9 %) і смартфон (-9 %). Таксама злёгку патаннелі цукар-пясок (-8 %) і прасяныя крупы (-10 %). Больш знізілі цану паўфабрыкат з мяса птушкі (-11 %) і вінаград (-17 %). А лідарамі нізкіх коштаў сталі грэчка і часнок, якія за мінулы год патаннелі на 29 % і 36 % адпаведна. Даныя мы бралі з Белстата (снежань 2017 года да снежня 2016 года).

ДАРАЖЭЎ ЛІФТ І ТАМАТЫ

Як мы бачым, у дзесятку самых дарагіх тавараў і паслуг увайшлі шматлікія паслугі ЖКГ, садавіна і агародніна. Карыстанне ліфтам стала каштаваць даражэй адразу на 83 %, ды і халоднае водазабеспячэнне — на 57 %. Ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне прыплюсавалі 29 %. Даражэла садавіна, прычым самая хадавая — бананы і яблыкі на 39 % і 46 % адпаведна. З агароднінай тое ж самае. Падаражэлі бульба (+24 %), морква (+24 %) і памідоры (+23 %).

Прадукты ў цэлым падаражэлі на 4,2 %, бензін — на 7 %, камуналка — на 16,5 %, інтэрнэт — 6,5 %, сотавая сувязь — 8 %.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

СОННАЯ ПАРАЧКА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах Віталя Гуменнага, такі лад жыцця характэрны для гэтых экзатычных жывёл, якія насяляюць толькі Афрыканскі кантынент. Іх паводзіны нагадваюць і парсючкоў, і мурашкаедаў. У дзікай прыродзе яны харчуюцца насякомымі — моцнымі лапамі разграбаюць тэрмітнікі, любяць рыць зямлю, адкуль доўгімі языкамі дастаюць розных жучкоў і чарвячкоў. Пасля таго, як падмацуюцца, зноў заляжаюць у спячку. Многія мужчыны зайздросцілі б такому ладу жыцця, жартуе Віталь Гуменны. Устаў, паеў, пачасаўся — і зноў на бакавую. За суткі ў бадзёрым стане знаходзяцца, можа, гадзіну. У заапарку трубказубы не здраджваюць сваім звычкам. Ім нават яшчэ больш часу застаецца на сон, бо ежу здабываць не прыходзіцца — яе ў цёплыя вальеры прыносіць іх даглядчыца Эльвіра.

Побач з трубказубамі пасялілася пара рэдкіх відаў гіен — земляных ваўкоў. Іх таксама завезлі нядаўна. Не кожны заасад можа пахваліцца такім відам, кажа Віталь Гуменны. Яны таксама насельнікі Афрыкі, харчуюцца дробнымі насякомымі і вядуць парна-адзіночны лад жыцця. Падчас наведвання земляныя ваўкі ціха ляжалі ў сваім доміку, амаль не рэагуючы на прысутных. Мабыць, ужо крыху абжыліся на новым месцы.

А вось для двух пар плямістых і паласатых гіен рыхтуюць вальеры з выхадам на вуліцу. Гэтыя віды таксама засяліліся нядаўна. Найбольш рэдкія з іх — плямістыя. Такіх гіен нідзе ў Беларусі не ўбачыш, і ў Гродзенскі заапарк яны трапілі ўпершыню. А вось паласатыя набытыя раней і нават маюць прыплод. Такім чынам, з чатырох відаў гіен тут знаходзіцца тры, што вялікая рэдкасць для заапаркаў. Віталь Гуменны адзначыў, што цяпер навукоўцы не лічаць пятністых гіен трупаедамі, як паласатых. Аказваецца, яны самі вядуць паляванне на жывёл і нават складаюць канкурэнцыю такім драпежнікам, як ільвы і тыгры. Але, у адрозненне ад каціных, яны усю здабычу поўнасцю ўтылізуюць.

І гіены, і трубказубы прывезены ў Гродна з Расіі на часовую экспазіцыю. Праўда, як доўга яны будуць тут, невядома. Магчыма да тае пары, пакуль на іх не будуць знойдзены пакупнікі. Паколькі ўсе віды парныя, то і прыплод таксама будзе належаць гаспадарам.

У найбліжэйшых планах ёсць намер набыць новыя віды жывёл. А вось канкрэтна якія — гаварыць рана, растлумачыў Віталь Гуменны. Паколькі большая частка паступае з Расійскай Федэрацыі, ёсць праблемы з афармленнем дакументаў, у тым ліку мытных працэдур. Гэтыя пытанні па-ранейшаму складаныя, хоць краіны знаходзяцца ў адзінай мытнай прасторы. І ўсё ж у студзені жывёлы павінны паступіць у Гродзенскі заапарк праз абменны фонд, у склад якога ўваходзяць альпакі, ламы, тыгры, зубры. Дарэчы, сімвалам Гродзенскага заапарка з'яўляецца менавіта зубр, яго выява размешчана на эмблеме.

Нядаўна ў заапарк паступіла пара рэдкіх белагорлых варанаў, якіх напярэдадні Новага года знайшлі на мяжы беларускія мытнікі. Вараны знаходзіліся ў сумцы, а гаспадары іх чамусьці так і не аб'явіліся. Мытнікі перадалі сумку з варанамі на ўтрыманне ў заапарк да тае пары, пакуль не вызначыцца іх лёс. Зараз па гэтым факце вядзецца расследаванне, шукаюць уладальнікаў каштоўнага грузу. Калі не знойдуць, суд вырашыць, куды накіраваць рэдкіх яшчарак. Пакуль яны выстаўлены для агляду ў заапарку. Ёсць верагоднасць, што тут і застануцца.

Што датычыцца продажу жывёл, то цяпер попыт у асноўным на дробных грызуноў. А вось некалькі гадоў таму добра купляліся ліс, кажуць, што для палявання. Можна набыць нават кенгуру, зараз, напрыклад, на рэалізацыі малады кенгуру Бенета. Гэты від сумчатых названы ў гонар аўстралійскага натураліста. А ўсяго ў заапарку ўтрымліваецца чатыры асобіны гэтага віду. Таксама рэалізуюцца капытныя — ламы, альпакі. Можна арандаваць гэтых і іншых жывёл для фотасесіі. Вядома, акрамя драпежнікаў. З гэтымі насельнікамі трэба абыходзіцца асцярожна, бо нават мірныя на выгляд каціныя тояць у сабе пагрозу. Не так даўно тут быў выпадак, калі львіца адкусіла руку даглядчыцы.

Некаторыя жывёлы маюць сваіх апекуноў. Імі з'яўляюцца прадпрыемствы і прадпрымальнікі. Шэфская падтрымка аказваецца яванскай макацы, буслам, у тым ліку чорным, яноту-паласкуну і іншым. У заапарку рады кожнаму апекуну.

Што датычыцца набыцця экзатычных відаў, то, згодна з апытаннем на сайце заапарка, наведвальнікі хацелі б у першую чаргу бачыць тут слана (35 %). На другім месцы — панда (22 %), на трэцім — жырафа (22 %). Менш за 10 % галасоў набралі такія жывёлы, як бегемот, лемур, качканос. Дарэчы, у заапарку жылі сланы, і не адзін. Апошнім быў слон Сурак, які загінуў ад хваробы ног гадоў дзесяць таму. Некалькі разоў былі спробы зноў набыць шэрага волата, але ўсё зрывалася. Хоць слаНоўнік пабудаваны і чакае свайго насельніка.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

Санаторыі для аленяў

У спецыяльныя каранцінныя вальеры засялілі 86 высакародных аленяў, якіх прывезлі з Літвы.

Алені змянілі «грамадзянства» на беларускае і цяпер на новых месцах будуць паступова асвойвацца. У вальерах для часовага ўтрымання цяпер 6 самцоў, 40 цяжарных самак і 40 маладых жывёлін, якім не споўніўся яшчэ год. Для жывёл створаны ўмовы, максімальна набліжаныя да тых, у якіх яны жывуць. І ўсё ж на тэрыторыі ёсць пляцоўкі для падкорму і штучныя вадаёмы. За жывёламі будуць назіраць і ахоўваць іх ад драпежнікаў. Прыкладна ў ліпені—жніўні, калі новае пакаленне аленянят моцна стане на ногі, усіх жывёл выпусцяць на волю.

— З 2015 года штогод мы закупляем аленяў у Прыбалтыцы і Нацыянальным парку «Прыпяцкі» для паляпшэння селекцыі, — гаворыць **старшыня Гомельскай абласной арганізацыйнай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Сяргей МАРЧАНКА.** — Гэта частка праекта па адраджэнні высакароднага аленя ў лясах вобласці, які ўваходзіць у дзяржпраграму «Беларускі лес» на 2016—2020 гады». З яе рэсурсаў за жывёл заплачана звыш 68 тысяч беларускіх рублёў.

Усяго з 2015 года ў лясы Гомельшчыны з улікам народжаных падчас ператрымкі выпушчана каля 150 высакародных аленяў. Сёлета плануецца засяліць яшчэ каля 80.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

На Ашмяншчыне таксама прапісаліся алені.



Адразу 28 новых жыхароў з'явілася нядаўна непадалёк ад аграгарадка Баруны, што ў Ашмянскім раёне. 15 самак высакароднага аленя, 12 аленянят да года і дарослы рагаты прыгажун пераехалі з Іўеўскай лясной гаспадаркі ў новы дом — вальер на сем гектараў.

У аленевай «хаце» ёсць крынічная вада, невялікая сажалка, запушчаны фруктовы сад, удосталь травы, дрэў і кустоў. Акрамя гэтага, навасёлаў будуць карміць сенам, саломай, зернем ды караняплодамі, запэўніваюць мясцовыя егеры.

Спецыялісты вераць, што да восені ў статку з'явяцца і крыху падрастуць аленяняты і ўсіх жыхароў вальера выпусцяць на цалкам вольнае жыццё.

Іван Шэпет, старшыня раённай арганізацыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, адзначыў, што раней алені ў Ашмянскім краі не вяліся. Сустракаліся тыя, хто заблукаў па дарозе дадому ў іншыя раёны. А тут высакародныя жывёлы з'явіліся дзякуючы дзяржаўнай праграме па абароне лесу «Беларускі лес» на 2016—2020 гг., якой прадугледжана развядзенне і гадоўля дзікіх жывёл у Беларусі.

Пакуль аленяў сцеражэ высокі плот уздоўж «хаты». Аднак мясцовыя егер і паляўнічыя перажываюць, што воўчая зграя, якая палюе ў суседніх лясах, ды паляўнічыя і проста цікаўныя людзі стануць частымі гасцямі вакол вальера. Тым не менш спецыялісты спадзяюцца, што капытныя лясныя жыхары адаптуюцца на новым месцы і пачнуць павялічваць папуляцыю ў прыродзе.

Ірына СІДАРОК.

■ Жыццёвінкі

Аднакласнікі

ПАСЛЯ заканчэння школы вучні нашага класа паразляталіся хто куды. Адны паступілі ў інстытуты ды тэхнікумы, другія — у прафтэхвучылішчы, трэція засталіся на месцы шчыраваць на зямлі ці ў фабрычным цэху. У названы пералік не ўпісаўся толькі Віктар Гвоздзь, які падаўся на шахты ў Данбас, куды яго сагітаваў паехаць брат Лявон, што прыязджаў у водпуск. І правільна зрабіў, бо школьныя прадметы, хоць ты трэсні, яму не даваліся. Праўда, апроч урокаў фізкультуры, дзе ў яго, самага дужага сярод усіх хлапцоў паралельных класаў, былі толькі выдатныя адзнакі. У цэлым жа Віктар перабіваўся з двоек на тройкі ды зрэдку на чацвёркі, калі праводзіліся пісьмовыя кантрольныя работы.

За пяць гадоў Чылі ператварылася з краіны-імпарцёра энерганосьбітаў, якая пакутуе ад спекуляцый і завышаных тарыфаў, у аднаго з найбуйнейшых вытворцаў сонечнай энергіі. Аднак, ураду прыйдзецца падумаць над доўгатэрміновай стратэгіяй развіцця аднаўляльнай энергетыкі, піша Financial Times. Пустыня Атакама ў Чылі — адно з самых сонечных і сухіх месцаў на планеце. Лагічна, што менавіта тут вырашылі пабудаваць найбуйнейшую ў Лацінскай Амерыцы сонечную электрастанцыю El Romero. Гіганцкія сонечныя панэлі пакрываюць 280 гектараў. Электрастанцыя генеруе столькі энергіі, якой дастаткова, каб забяспечыць электрычнасцю 240 тысяч дамоў. Цяпер Чылі вырабляе практычна самую танную сонечную энергію ў свеце. Кампаніі спадзяюцца, што краіна стане «Саудаўскай Аравіяй для Лацінскай Амерыкі». Да 2040 года Чылі збіраецца цалкам перайсці на «чыстую» энергетыку.

Сярод перспектыўных кірункаў — турызм. Нягледзячы на аддаленасць, дзівосы «краіны цудаў» прыцягваюць вялікую колькасць замежных гасцей. Летась Чылі наведала 6,4 млн замежных турыстаў, што на 14,3 % больш, чым годам раней. Пра гэта паведамілі мясцовыя СМІ, спасылаючыся на словы міністра турызму краіны Джаўера Монтэса. Выдаткі турыстаў таксама выраслі на 35,6 % і склалі каля $4,2 млрд. Сёлета ўлады Чылі разлічваюць прыцягнуць больш за 7 мільёнаў замежнікаў.

Як адзначаюць эксперты, сёння Чылі мае найбольш эфектыўную эканоміку ва ўсёй Лацінскай Амерыцы і адносіцца да краін з вельмі высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу. Краіна мае адзін з самых нізкіх узроўняў карупцыі паводле рэйтынга Transparency International. Па звестках аналітыкаў, цяпер Чылі заняла першую пазіцыю па інтэгральным паказчыку канкурэнтаздольнасці сярод краін Лацінскай Амерыкі. Як заўважаюць аналітыкі, асновай поспеху Сант'яга стала аптымальнае спалучэнне лібералізацыі і адкрытасці эканомікі, з аднаго боку, і эфектыўнага дзяржаўнага рэгулявання, з другога. У выніку Чылі мае адзін з самых высокіх даходаў на душу насельніцтва ў Лацінскай Амерыцы.

Гаспадар La Moneda

Мільярдэр Себасцьян Піньера (нумар восем у рэйтынгу Forbes найбагацейшых чылійцаў) абраны прэзідэнтам Чылі і пасля чатырохгадовага перапынку зноў стане гаспадаром прэзідэнцкага палаца La Moneda ў Сант'яга-дэ-Чылі. У другім туры выбараў, якія адбыліся 17 снежня, 68-гадовы кандыдат правага альянсу «Чылі, наперад!» набраў 54,57 % галасоў (дарэчы, Піньеру ўдалося атрымаць рэкордную колькасць галасоў з 1990 года), сведчаць звесткі чылійскага Цэнтрвыбаркама. Саперніка мільярдэра — кандыдата ад кіруючай левацэнтрысцкай кааліцыі 64-гадовага сенатара, тэлежурналіста і сацыёлага Алехандра Гільера Альварэса — падтрымалі 45,43 % выбаршчыкаў.

Себасцьян Піньера нарадзіўся ў забяспечанай сям'і, яго бацька быў паслом Чылі ў Бельгіі і пастаянным прадстаўніком краіны пры ААН. Яго брат — эканаміст Хасэ Мануэль Піньера, які ўваходзіў у групу так званых «чыкагскіх хлопчыкаў» і з 1978 па 1980 гады быў міністрам працы і сацзабеспячэння. «Чыкагскія хлопчыкі» — 25 чылійскіх эканамістаў, якія скончылі Каталіцкі ўніверсітэт Чылі і атрымалі доктарскія ступені на факультэце эканомікі ўніверсітэта Чыкага, які ў той час узначальваў аўтар канцэпцыі «шокавай тэрапіі» Мілтан Фрыдман. Пры Піначэце яны правялі неаліберальныя рэформы па пабудове эканомікі «свабоднага рынку».

Па адукацыі Себасцьян Піньера эканаміст, у 1970-х атрымаў доктарскую ступень у Гарвардзе. У 1980-я гады ён адкрыў першую ў Чылі кампанію па вытворчасці крэдытных картаў (Boncard), на чым пасля і зарабіў свой капітал. Акрамя кампаніі Boncard яму належалі 27 % акцый найбуйнейшай чылійскай авіякампаніі Lan Airlines, тэлеканал Chilevision і 13 % найпапулярнейшага футбольнага клуба краіны Colo-Colo. Аднак, атрымаўшы перамогу на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года, Піньера прыняў рашэнне аб продажы ўсіх гэтых актываў. Яго першы прэзідэнцкі тэрмін быў адзначаны актыўным эканамічным развіццём рэспублікі.

Запыт грамадства

Перамогу Себасцьяна Піньеры можна лічыць новым сведчаннем таго, што «правы паварот» у Лацінскай Амерыцы працягваецца: за апошнія два гады левыя страцілі прэзідэнцкія крэслы ў Перу, Аргенціне, Бразіліі і цяпер у Чылі. Себасцьян Піньера атрымаў падтрымку тых чылійцаў, якія лічаць, што іх краіне патрэбен свабодны рынак і эканамічны рост. Пры Мішэль Бачэлет ён упаў да сціплых 1,4 % у год, хоць падчас папярэдняга прэзідэнцкага тэрміну Піньеры складаў у сярэднім 5,4 %. Прадпрымальнік, чый капітал (па ацэнцы Forbes) складае $ 2,7 млрд (Піньера стане другім дзеючым прэзідэнтам мільярдэрам на амерыканскім кантыненце разам з Дональдам Трампам, капітал якога ацэньваецца ў $3,1 млрд), абяцае зрабіць стаўку на прыцягненне замежных інвестыцый, стварыць 600 тыс. новых працоўных месцаў, знізіць карпаратыйныя падаткі і ўпарадкаваць прамысловае рэгуляванне. Пры гэтым змены ў стратэгіі ўрада ні пры якіх абставінах не будуць радыкальныя. На апошнім этапе прэзідэнцкай гонкі Себасцьян Піньера нават ускосна падтрымаў план увядзення ў Чылі бясплатнай вышэйшай адукацыі, распрацаваны левацэнтрыстамі, які выклікаў нямала спрэчак у грамадстве.

У 2010 годзе, калі палітык першы раз прыйшоў на змену Мішэль Бачэлет, ён таксама абяцаў весці краіну наперад, не руйнуючы палітычнай спадчыны левацэнтрысцкага ўрада. І абяцанне гэта ў цэлым выканаў. Свайму поспеху на выбарах кандыдат-мільярдэр таксама шмат у чым абавязаны рэпутацыі чалавека, здольнага да суперажывання і гатоўнасці прыйсці на дапамогу тым, хто трапіў у бяду. Гаворка ідзе аб паспяхова праведзенай у 2010 годзе аперацыі па выратаванні 33 шахцёраў, якія аказаліся ў падземным палоне на меднай шахце Кап'япа на поўначы Чылі. На глыбіні 700 метраў яны правялі 69 сутак. Себасцьян Піньера асабіста ўзначаліў і аплацію выратавальную аперацыю, за якой назіраў увесь свет. Усе шахцёры былі ў выніку паднятыя на паверхню і выратаваны. Чылійцы належным чынам ацанілі гэтыя намаганні, а сам прэзідэнт потым запэўніў: «Цяпер людзі ўсяго свету будуць асацыяваць Чылі з аперацыяй па выратаванні шахцёраў, а не з гадамі праўлення ваеннай хунты». Падчас перадвыбарнай гонкі менавіта кандыдат-мільярдэр быў фаварытам прадпрымальнікаў і інвестараў. Ён неаднаразова заяўляў і аб падтрымцы гарнаруднай вытворчасці — у сваёй праграме запэўніваў, што будзе дапамагаць нацыянальнай меднай карпарацыі Codelco.

Па словах экспертаў, пакуль складана рабіць пэўныя прагнозы наконт знешнепалітычнага курсу, які абярэ Піньера, — ён яшчэ не рабіў канкрэтных заяў на гэтую тэму. Яго перадвыбарчыя абяцанні выстройваліся ў асноўным вакол праблем унутранай павесткі, што ў цэлым адпавядае запыту ў чылійскім грамадстве і, верагодна, стала адным з фактараў, якія вызначылі зыход выбараў. «Яго перамога была бясспрэчная, таму што чылійскае грамадства ўжо стомлена ў вядомым сэнсе ад Concertacion (Гуманістычная партыя Чылі. — **Аўт.**). Піньера — прыхільнік стратэгічнага партнёрства з ЗША і ў цэлым дастаткова жорсткі, кансерватыўны дзеяч», — заўважыў gazeta.ru намеснік дырэктара Інстытута Лацінскай Амерыкі РАН Уладзімір Сударaў. Эксперт адзначыў, што Піньера будзе ўсяляк стымуляваць удзел Чылі ў Ціхаакіянскім альянсе, а таксама працягне развіваць адносіны з КНР. «З Кітаем усё па-ранейшаму будзе вельмі добра, паколькі Чылі — ціхаакіянская платформа для яго пранікнення ў лацінаамерыканскія краіны Атлантыкі», — растлумачыў Уладзімір Сударaў, адзначыўшы, што ў цэлым палітыка Піньера будзе пераважна арыентавана на рашэнне ўнутраных эканамічных праблем.

Захар БУРАК.
burak@zviazda.by

■ Кінакрокі

Вячаслаў НІКІФАРАЎ:

«Калі б у мяне была магчымасць зняць «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», пасля можна было б сысці разводзіць трусоў»

У 2016 годзе «Беларусьфільм» прадставіў толькі адзін ігравы фільм, затое пасля пачаў здымкі адразу некалькіх. У снежні ў кінатэатрах можна было ўбачыць першы з іх — альманах дэбютных работ «Мы», а ўжо 25 студзеня ў пракат выходзіць карціна Вячаслава Нікіфарава «Тум-пабі-дум». У разлічаным на сямейны прагляд фільме распавядаецца пра гадаванца дзіцячага дома Санька, які вырашыў сам знайсці сабе бацькоў. Напярэдадні прэм'еры мы пагутарылі з рэжысёрам карціны, які па сумяшчальніцтве з'яўляецца мастацкім кіраўніком кінастудыі.

— Вы неяк выказалі думку пра тое, што беларускае кіно стане цікавым тады, калі будзе расказваць пра свае зямлю, краіну і людзей. Ці з'яўляецца фільм «Тум-пабі-дум» добрым прыкладам гэтай ідэі?

— Як раней лічылі: нацыянальны фільм — гэта калі сцэнарыст, рэжысёр і акцёры з'яўляюцца беларусамі. Мы ўнікальныя і непаўторныя згодна з самім прыродным парадкам, — у чым боскасць кожнага з нас. Між тым у цэлым спрашчаць не варта: няхай хоць эфіоп прыедзе і раскажа пра нашу краіну, але так, як ніхто яшчэ не расказаў.

«Я не марыў аб пасадзе мастацкага кіраўніка кінастудыі і адразу сказаў, што скарыстаюся першай магчымасцю, каб здымаць кіно».

— То-бок беларускае кіно аўтаматычна цікавае праз нацыянальную адметнасць?

— Так, у нас унікальны народ на скрыжаванні войнаў і культур і ўнікальная гісторыя з геапалітычнымі амбіцыямі буйных суседзяў. Культурыца са сваімі дзівакамі — найярчэйшы прыклад: ён цікавы, хоць ніколі не паказваў напамаджаных герояў, з якімі можна дайсці толькі да макіяжу ў сэнсе фальшывасці і знявечвання твару культуры. Ясенін пісаў: «Канарейка с голоса чужого — жалкая, смешная побрякушка. Миру нужно песенное слово петь по-свойски, даже как лягушка». То-бок нават калі ў цябе самыя немузыкальныя спевы, яны ўсё ж такі твае, і толькі гэтым ты можаш быць цікавы. У фільме не абавязкова праз кожную хвіліну павінна гучаць слова «беларускі», важней ідэя, якая нараджаецца на гэтай зямлі, нават калі гэта нешта накшталт «Касмічнай адысеі». У нас ёсць цудоўны сцэнарый Аляксея Дударава пра вайну, заснаваны на яго п'есе «Радавыя», якая ў савецкія часы доўга ішла на сцэне, за яе аўтар атрымаў дзяржпрэмію. І мне кажуць: «Ну пра вайну і ў Расіі даволі шмат здымаецца». Але ў Расіі няма таго, што ёсць у нас, бо ні адна вайна не падобна на тую, якую паказаў Дудараў. Уявіце, калі мы здымем фільм па гэтым сцэнарыі, у час затоенай, але рэальнай трэцяй сусветнай вайны з маленькай Беларусі пойдзе мэсэдж: «Хлопцы, вы яшчэ не наваяваліся?» У яе ёсць маральнае права гаварыць пра агіднасць вайны.

— Што вы скажаце пра відавочную нацыянальную адметнасць вашай карціны?

— Фільм пранізаны атмасферай Мінска. Пасля прагляду мне кажуць: «Які ў нас прыгожы горад!» Частка здымак прайшла ў канкрэтным радашковіцкім дзіцячым доме, былі задзейнічаны яго гадаванцы. У сцэнарыі я даў дзіцячаму дому нумар 17, але даведаўся, што колькасць такіх устаноў у краіне скарачаецца і двухзначных лічбаў ужо няма. Магчыма, хутка застанецца адзін дзіцячы дом, ніхто больш не можа пахваліцца такой тэндэнцыяй. У мяне часта пытаюцца, як вызначыць добры фільм, і я раю ў першую чаргу звярнуць увагу на эпізоды са смерцю героя і пасцельныя сцэны. Праз гэта адразу зразумела, якога калібру кіно і рэжысёр. Але ёсць яшчэ адна важная рэч, па якой можна ацэньваць карціну — па яго галоўным героі. Фільм стане паспяховым, калі герой створаны небанальна, нашага Санька мы імкнуліся зрабіць аб'ёмным, такіх пацаноў, як ён, не было. У кінакультуры найбліжэйшая паралель нашай карціне — «Плюмбум» Вадзіма Абдрашытава, але калі параўнаць персанажаў — усё зусім рознае. Наш галоўны герой — вельмі складаны кактэйль: ён эрудзіраваны, начытаны ў прававой, медыцынскай і мастацкай літаратуры, валодае некалькімі мовамі. Ён прытрымліваецца маральных шаблонаў і разумее, што дарослыя — як па кругаглядзе, так і па маральных арыенцірах — не заўсёды адпавядаюць яго чаканням.

— Я чула пра талент адэскага хлопчыка Арцёма Венгеровіча, які выконвае ў фільме галоўную ролю. Як вы яго знайшлі?

— Ён вынырнуў у шоу «Украіна мае талент». Мы яго ўбачылі на экране і ўчапіліся, тым больш што Арцём як раз чытаў маналог пра дзетдомаўцаў. Ён і ў рэальнасці разумны, адукаваны, ведае замежныя мовы. У фільме ён размаўляе нават на кітайскай, шпарыць па-італьянску. Праўда, Арцёму ўжо адзінаццаць, а персанажу — дзесяць. Акрамя яго ўсе акцёры беларускія, усё зроблена тут, нашымі сіламі, а персанаж бабулі-прафесара размаўляе на мове. Я сустракаў шмат людзей — сярод іх Васіль Быкаў, Генадзь Бураўкін, Галіна Макарава — з неверагодна прыгожай беларускай, таму захацеў, каб Вольгу Клебановіч, якая вельмі таленавіта сыграла прафесарку, пераагучыла Таццяна Мархель, таму што яе вымаўленне лепшае. У нашай карціне можна знайсці і шмат украпванняў — знакаў беларускай культуры. Адзін з іх — партрэт Уладзіміра Караткевіча, якога я абажаю. Калі б у мяне была магчымасць зняць «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», пасля можна было б сысці разводзіць трусоў.

— У вашага фільма даволі інтрыгуючая назва, што яна значыць?

— Ключавое слова «інтрыгуючая», на гэта і быў разлік, хоць не толькі. Па сюжэце ў дзіцячым доме праходзіць дзень адкрытых дзвярэй, куды прыязджаюць сваякі, шэфы і іншыя. Тут гучыць песня — яе напісалі самі дзеці, — якая заклікае прыдумаць уласны свет і напісаць толькі ў ім зразумелую мову. «Ты нічога не саромейся, гэта наша краіна, тут можна гучна смяяцца, няхай усе ў свеце запяюць як адна сям'я «тумпабідумную» песню». Просценькая кампазіцыя натхняе персанажа ісці наперад. Яна вызначыла не толькі назву — у цітрах ёсць «тумпабідумны» Мінск, што значыць, дзіцячы, мульцяшны, радасны, бо ў фільме па вялікім рахунку мы бачым свет вачыма дзяцей.

«У Беларусі ёсць таксама свабодныя камерцыйныя студыі са сваімі масштабамі і спецыфікай. Магчыма, там выявіцца геній...»

— Як я зразумела, здымачны перыяд цягнуўся чатыры месяцы. Ці гэта не экстрэмальныя ўмовы?

— Я не люблю, калі група выходзіць на сцэну і расказвае, як было цяжка здымаць. У такія моманты хочацца параіць пайсці ў лазнева-пральны трэст альбо куды-небудзь, дзе ціха, цёпла і спакойна. У нас проста так склалася, што да заканчэння рэканструкцыі «Беларусьфільма» (рэканструкцыя завяршылася ў лістападзе 2017 года. — **Аўт.**) трэба было нешта паказаць і тэрмінова зняць штосьці мілае, прыгожае і не вельмі дарагое. Конкурс (Адкрыты рэспубліканскі конкурс кінапраектаў Міністэрства культуры. — **Аўт.**) замест красавіка атрымалася правесці толькі ў ліпені, а 20 ліпеня павінен быў пачацца здымачны перыяд. Менавіта станоўчае рашэнне конкурсу адкрывае фінансаванне, якое мы атрымалі 18 ліпеня, за два дні да здымак. Падрыхтоўчы перыяд павінен цягнуцца два месяцы, але мы іх страцілі. Да таго ж не кожны супрацоўнік можа пахваліцца высокім прафесіяналізмам. Гэта ўвогуле асобная тэма — вытворчасць менавіта сваіх фільмаў запушчаная, найлепшыя работнікі працуюць на замежных праектах. Я не марыў аб пасадзе мастацкага кіраўніка кінастудыі і адразу сказаў, што скарыстаюся першай магчымасцю, каб здымаць кіно. Яна хутка з'явілася, але ў такім выглядзе: мы не маглі нават кашулю акцёру купіць, усё рабілася на хаду і аказалася на мне замкнёна. Звычайна рэжысёр адгароджаны трыма-чатырма памочнікамі і асістэнтамі, да яго з дробязямі не звяртаюцца, але ў гэтым выпадку ўсе дробязі былі на мне. Я напакутаваўся і намучыў людзей, затое зразумеў, што вытворчасць уласных фільмаў у нас валяецца амаль каля плінтуса, што пачалося ўжо даўно. Сённяшняму дырэктару (Ігар Поршнеў. — **Аўт.**) дасталіся руіны, ён прыйшоў як крызісны менеджар. Вы будзеце смяяцца, але калі я пачаў тут працаваць, мне два месяцы не маглі купіць чайнік. Абаротных сродкаў амаль няма, для таго каб у нашым пракаце акупіць нават недарагую карціну за 300 тысяч долараў, трэба кожнаму гледачу яе тры разы. А каб выйсці за межы нашых кінатэатраў, патрэбны адпаведны ўзровень, гэта значыць, таленавіта зроблены фільм, бо замежны рынак проста так нікога не прымае. Таму я і кажу, што мы будзем цікавыя, калі будзем здымаць пра сябе, але здымаць таленавіта. У краіне толькі пяць-шэсць рэжысёраў, якія пры добрым сцэнарыі могуць зрабіць варты фільм. А ведаеце колькі трэба? Пры аб'ёме ў шэсць малабюджэтных фільмаў у год — васямнаццаць. Сёння нашы аўтары нават не здольныя закрыць усе праекты, якімі займаецца «Беларусьфільм», таму што шэсць запусцілі, а хутка трэба запускаць яшчэ шэсць, то-бок трэба шукаць восьмага, дзявятага і дзясятага рэжысёраў. Такім чынам, год-два мы будзем глядзець фільмы, якія нельга было не запусціць.

— Значыць, запрашэнне аўтараў з боку — гэта вымушаная мера?

— Так, гэта выйсце. Але ў першую чаргу трэба палепшыць выкладанне. Я меў справу з рэжысёрамі, якія выпусціліся з Акадэміі мастацтваў. У іх ёсць вучэбныя работы, а цяпер ім трэба паказаць сябе ў працы, каб студыя вырашыла, ці можна ім даверыць больш сур'ёзныя мастацкія і камерцыйныя задачы. Аказалася, яны не ведаюць вытворчасць, а значыць яны — паўрэжысёры. У Фелініі, скажам, дзесяць асістэнтаў, і тры з іх насілі за ім паперы і гарбату. Дзесяць гадоў яны так працавалі, а на адзінаццаты здымалі шэдэўр. Вучыцца трэба побач з майстрам у вытворчасці! Нашым дай добры сцэнарый, яны яго пачнуць перапісваць. Хто ім сказаў, што яны сцэнарысты, што іх бачанне — гэта ўсё? Сцэнарыст — гэта асобная, вельмі складаная прафесія, а сваё бачанне трэба яшчэ займець, а спачатку хаця б добра зняць фільм па сцэнарыі. Прыходзіцца тлумачыць, што не заўсёды атрымліваецца рабіць аўтарскае кіно, а на дзяржаўнай студыі трэба дасягаць мэтаў, якія ставіць перад сабой дзяржава.

«Сёння нашы аўтары нават не здольныя закрыць усе праекты, якімі займаецца «Беларусьфільм», таму што шэсць запусцілі, а хутка трэба запускаць яшчэ шэсць».

— А якія ў дзяржавы мэты?

— Яны адлюстраваны ў стратэгіі, трыццаці пазіцыях, якія раней назвалі б тэмпланам. Тут пазначаны, скажам, гістарычны фільм, нацыянальны герой, класіка, па гэтых правілах іграе кінастудыя. Калі ў Акадэміі з'яўляецца больш-менш заўважная курсавая работа — мы яе маем на ўвазе. Аўтараў для чарговага альманаха дэбютаў мы выбіраем з 15—20 асоб. У Беларусі ёсць таксама свабодныя камерцыйныя студыі са сваімі масштабамі і спецыфікай. Магчыма, там выявіцца геній, але, на жаль, гэта малаверагодна. Дзясяткі два маладых людзей праз мяне прайшло, і іх светапогляд мяне палохае. Часам усё, чаго можна чакаць, што ён як дырыжор выйдзе і скажа: «Ну, у вас усе ноткі ёсць? Давайце — іграйце». Абазначаная стратэгія ў сферы кінематографа стала адной з прычын, чаму я згадзіўся прыйсці на «Беларусьфільм». Пятнаццаць гадоў я быў не запатрабаваны, а калі майстры не патрэбны — гэта прыкмета ўпадку. У 2010 годзе пайшоў з жыцця Ігар Дабралюбаў, які з фільмам «Іван Макаравіч» першы прывёз прыз з Венецыі. Яго нават выкладаць не запрасілі, а ў той жа час ён дэбютантаў называў саджанцамі і казаў, што іх трэба песціць. Валерый Рыбараў таксама застаўся ўбаку. Я працаваў у Расіі і праводзіў тут па паўгода, быў у тусоўцы, а мне казалі, што я здрадзіў Радзіме і спакусіўся на грошы. Баяліся канкурэнцыі. У беларускім кіно ёсць такая загана. Былы міністр культуры Аляксандр Сасноўскі ў адным з інтэрв'ю сказаў: «Я зразумеў кінематаграфістаў: яны пагодзяцца пазбавіцца вока, але каб у суседа другога не было». Няхай агульная характарыстыка застанецца на сумленні экс-міністра, але доля праўды ў ёй ёсць. Гэта нездаровая сітуацыя і зараз праяўляецца, у сацсетках безадказна пішуць, што нехта нешта крадзе. А дзеля росквіту беларускага кіно першае, што трэба зрабіць кінематаграфістам, — салідарызавацца.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ З юбілеем!

СПЕЛЫ ЖНІВЕНЬ НАВУМА ГАЛЬПЯРОВІЧА

Яго голас ведае, без перабольшання, амаль уся рэспубліка, бо ён вось ужо трыццаць з лішнім гадоў гучыць на хвалях Беларускага радыё.

Яго вершы і апавяданні добра знаёмыя шматлікім аматарам літаратуры, бо творы гэтыя пазначаны шчырасцю, дабрынёй, талентам.

Яго як дырэктара радыёстанцыі «Беларусь» цэняць і паважаюць у калектыве, бо ён умее кожнага супрацоўніка своечасова пахваліць, тактоўна, разумна пакрытыкаваць і, калі трэба, памагчы, падтрымаць.

А для мяне ён — добры сябра, з якім заўсёды цікава пагаварыць і памаўчаць.

Усё гэта — пра Навума Гальпяровіча, вядомага радыёжурналіста, выдатнага паэта, якому 14 студзеня спаўняецца 70 гадоў. З гэтай нагоды мне хочацца сказаць колькі слоў.

Сцвярджаюць: каб паўней адчуць, зразумець чалавека, трэба зрабіць тры рэчы — пабываць на яго малой радзіме, натхніць на адкрытую, нязмушаную размову і, калі гэта паэт, пачытаць яго творы.

На малой радзіме Гальпяровіча — у Полацку — мы разам з ім пабывалі не адзін раз. Навум Якаўлевіч шчодра пазнаёміў мяне не толькі з родным горадам, але і з усёй Полаччынай, уключаючы Наваполацк. Дарэчы, у абодвух гэтых гарадах ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам, тут яго да гэтага часу памятаюць і шануюць. Я быў сведкам, калі на полацкіх вуліцах сустрэчныя людзі, пазнаўшы яго, радасна віталі, а то і ўсхвалявана абдымалі.

Яму пашчасціла нарадзіцца ў, бадай, самым славутым горадзе краіны, а дзяцінства і юнацтва правесці паміж дзвюма святынямі — Сафійскім саборам (вежы якога ён упершыню пабачыў праз акно радзільнага дома) і Спаса-Праабражэнскай царквой, паблізу якой стаяла бацькоўская хата.

Пад час адной з вандровак мы завіталі на лецішча Гальпяровіча — у невялічкую, за трыццаць кіламетраў ад Полацка вёсачку Зыкова. Пасля знаёмства з глухой, дзе здавалася, не ступала нага чалавека, але надзвычай маляўнічай мясцінай, пасля наварыстай юшкі і пэўнай чаркі мы прагаварылі з Навумам Якаўлевічам амаль цэлую ноч.



У канцы 2017 года выйшла з друку новая кніга Навума Гальпяровіча «Час лістападу» — ранейшыя творы і тыя, што напісаны апошнім часам. Фотапартрэт аўтара быў прадастаўлены выдавецтву фотакарэспандэнтам газеты «Звязда» Яўгенам Пясецкім (сябрам паэта з юнацкіх гадоў, аднакурснікам па часе вучобы ў Белдзяржуніверсітэце).

— Для мяне Полацк, — прызнаваўся ён, — не проста нейкае геаграфічнае месца. Гэта яшчэ і прыналежнасць да Беларусі. Да беларускага слова. Да беларускай культуры. Скажу нават больш: беларусам мяне зрабіў менавіта Полацк. Беларусам не па крыві, а беларусам па духу, па адчуванні таго, што я павінен, абавязаны нешта рабіць для беларускай мовы, беларускай культуры.

Такія прызнанні, банальна кажучы, дарагога вартыя.

І нарэшце было чытанне і перачытванне твораў Навума Гальпяровіча.

Але перад гэтым я мушу зрабіць невялікае адступленне. Яго паэтычны дэбют адбыўся ў 1967 годзе, калі Навум Якаўлевіч працаваў яшчэ грузчыкам на заводзе шкловалакна. У наваполацкай газеце «Химик» была апублікавана вялікая падборка ягоных вершаў і нават з партрэтам аўтара. Але вершы гэтыя былі яшчэ даволі слабыя, пераймальныя. Да таго ж на рускай мове. Таму сапраўдным пачаткам літаратурнай дзейнасці ён лічыць публікацыю вершаў у часопісе «Маладосць».

Потым была праца ў Полацкай раённай газеце «Сцяг камунізму», на заводзе «Палімір», на Беларускім радыё, у часопісе «Вожык», Саюзе пісьменнікаў Беларусі, вяртанне на Беларускае радыё. «Але заўсёды са мной быў мой родны Полацк, які па-ранейшаму адзін з галоўных чыннікаў майго духоўнага жыцця», — напіша пазней у сваёй аўтабіяграфіі Навум Гальпяровіч. І, вядома ж, былі творы. Кнігі паэзіі і прозы.

Адзін з іх — зборнік вершаў «Час лістападу», які толькі што выйшаў у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Зборнік гэты не шараговы. Ён у нейкім сэнсе знакавы, выніковы, бо ў ім сабраны і вельмі патрабавальна адабраны аўтарам найлепшыя свае вершы, створаныя за паўстагоддзя творчай дзейнасці. Думаецца, што гэта самая спавядальная, самая духоўна насычаная і душэўна адкрытая кніга з усіх, што выдадзены паэтам. У ёй, невялікай па аб'ёме, канцэнтрацыя эмоцый, пачуццяў і думак такой сілы, што яна, гэтая кніга, можа і павінна стаць падзеяй у літаратурным жыцці краіны.

«Час лістападу»... У гэтай прыгожай, рамантычнай назве тоіцца не толькі намёк на пару года, але і на ўзрост аўтара. Сапраўды, Навум Гальпяровіч пераступае тую мяжу, за якой пачынаецца пара сталасці і мудрасці. Пара спелага жніўня.

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.

«Звязда» далучаецца да шматлікіх віншаванняў, якія Навум Якаўлевіч будзе прымаць заўтра. Зычым нашаму аўтару і добраму сябру здароўя, натхнення і плёну!

■ Тэатр

З БЕЛАРУСКІМ КАЛАРЫТАМ

Фестываль батлеечных і лялечных тэатраў запрашае ў Свята-Елісавецінскі манастыр

Міжнародны Калядны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы», які праходзіць у Мінску з 11 да 14 студзеня, ладзіцца ўжо чацвёрты раз. Калі раней батлеечны тэатр распаўсюджваў хрысціянскія каштоўнасці, то цяпер хрысціянскі свет дапамагае адраджэнню батлейкі: фэст праходзіць па бласлаўленні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ў Адукацыйным цэнтры Свята-Елісавецінскага манастыра.

Сюды варта завітаць не толькі дзеля тэатра, але і па шчырую і светлую атмасферу Раства Хрыстовага, бо на сцэне — перамога дабра над злом, чароўныя пераўтварэнні, прыгожыя лялькі. Як звычайна, мастацкім кіраўніком фестывалю з'яўляецца ўлюбёнец дзяцей, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага Аляксандр Ждановіч.

Пры ўсёй разнастайнасці народных лялечных тэатраў, батлейка — беларуская з'ява. Традыцыйна ў скрыні-Батлееме ўзаемадзейнічалі Боскае Немаўля і Анёл, цар Ірад і Чорт, Рахіль і салдаты... З цягам часу батлеечны тэатр апроч рэлігійных тэм стаў звяртацца і да свецкіх: вандроўныя лялечнікі прадстаўлялі актуальныя сюжэты, перад аўдыторыяй з'яўляліся мужыкі і бабы, гандляры і карчмары, паны ды сяляне, побытавыя гісторыі смяшылі гледачоў. Батлейка стаяла ля вытокаў нашай драматургіі, а ў выніку паступова аддала ёй свае жыццёвыя сілы і з распаўсюджанай дзеі ператварылася ў з'яву адзінкавую і выключную.

Але арганізатары імкнуцца захаваць традыцыі: выступы на «Нябёсах» адбываюцца ў перыяд калядных святак — у час, калі нашы продкі з нецярпеннем чакалі вандроўныя тэатры. Яшчэ да пачатку фестывалю дабрачынная акцыя «Святло душы — дабрадзейнасць» нагадала пра неабходнасць дапамагаць бліжняму: батлеечнікі ды лялечнікі разам са сваімі скрынямі распачалі шэраг візітаў у інтэрнаты і бальніцы, каб падзяліцца калядным цудамі з тымі, каму яны вельмі патрэбныя. Нездарма сёлетні дэвіз «Нябёсаў» — «Лялькі дораць радасць!»

Праект пашыраецца з кожным годам. Летась удзел у фестывалі

Фота Кастуся ДРОБАВА.

ўзялі калектывы з Беларусі, Расіі, Украіны ды Польшчы. На чацвёртае свята батлейкі ў Мінск — акрамя беларусаў, украінцаў ды расіян — завіталі тэатры з Літвы, Эстоніі, Вялікабрытаніі і Германіі. Усяго на «Нябёсах» выступіць дваццаць калектываў, сярод якіх прадстаўнікі міжнароднай асацыяцыі «Вандроўныя лялечнікі», а трыумфатар мінулага года маскоўскі тэатр «Душагрэі» пакажа свой новы спектакль. Гледачоў чакае насычаная праграма: класічныя сюжэты пра цара Ірада, вясёлыя і пазнавальныя спектаклі са свецкай тэматыкай, для маленькіх і дарослых наведнікаў будуць арганізаваны тэматычныя круглыя сталы, выстаўкі, майстар-класы, творчыя сустрэчы. Калі шукаеце, куды пайсці з дзецьмі на стары Новы год, варта завітаць на «Нябёсы».

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

■ У закрытай прасторы

Не першы баль Наташы Растовай

Прыйшоў час штогадовага вальсу сярод тэатральных калон

Традыцыйны, ужо дзявяты, Вялікі Навагодні баль адбудзецца сёння ў Вялікім тэатры оперы і балета. Мы пісалі пра яго яшчэ ў кастрычніку, калі арганізатары і будучыя госці пачалі рыхтавацца да мерапрыемства праз урокі танцаў пад кіраўніцтвам балетмайстра-рэпетытара Вялікага тэатра Юліі Дзятко.

Куды паставіць нагу ў вальсе — канешне, не адзінае, што трэба ведаць на такім мерапрыемстве, але шмат чаго адбываецца аўтаматычна — выпрастваецца спіна, мяняюцца паходка і позірк, прыходзіць адпаведны настрой. Тым больш што танцавальны майстар-клас адбудзецца і на самім балі, як і неверагодная колькасць іншых пунктаў багатай праграмы — музыка Іспаніі і фольк, старадаўнія танцы, арт-квэст, бармен-шоу, магчымасць пагутарыць з салістамі тэатра і іншае.

Вялікі баль такім чынам прапануе не толькі эксклюзіўную праграму, але і знаходжанне на ўрачыстасці былой эпохі. Хоць поўнасцю адарвацца ад рэальнага свету не атрымаецца: такія словы, як квэст, бармен і караоке стануць яго актуальнымі знакамі. Так, балі ўжо не тыя, але з іх мадыфікацыямі гэта ўсё яшчэ балі.

Урачыстае адкрыццё адбудзецца а дзявятай гадзіне вечара ў фае бельэтажа тэатра. Спадзяёмся, гэтай ноччу на прыступках да Вялікага нехта згубіць свой туфлік і распачне ўласную казку.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ

■ Канцэрт

ФОЛЬК І РОК

Калядкі Паспяшальскіх працягнуць святочны настрой

Сённяшнім вечарам — якраз на Стары Новы год, у цэнтры Мінска каля Ратушы, у канцэртнай зале «Верхні горад» адбудзецца выступленне ўнікальнага музычнага гурта з Польшчы. Аркестр з пятнаццаці чалавек, якія належаць двум пакаленням адной сям'і Паспяшальскіх, выступіць тут з праграмай калядак і пастараляў у аўтарскай апрацоўцы.

Канцэрт у Мінску — звяно міжнароднага канцэртнага турнэ аркестра, але Паспяшальскія ў нашай краіне не ўпершыню. Два гады таму, напрыклад, яны выступілі ў Архікафедральным саборы імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Мінску, а сённяшняму канцэрту ў мінскім «Верхнім горадзе» папярэднічала ўчарашняе выступленне ў парафіі Найсвяцейшага Адкупіцеля ў Гродне. На сцэне Паспяшальскія выканаюць як класічныя фальк-версіі калядак і пастараляў, так і іх апрацоўкі ў стылях джаз і рок-музыкі.

Канцэрты Паспяшальскіх шмат разоў запісваліся для польскага тэлебачання, польскае радыё часта круціць калядкі гурта, музыканты супрацоўнічаюць з небезвядомымі польскімі калегамі Войцахам Мазалеўскім, трыа Януша Прусіноўскага, Міхалам Урбанякам, Адамам Стругам, Voo Voo, Raz Dwa Trzy, Daga Dana ды іншымі. Першы дыск Паспяшальскія запісалі яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў. Цікава, што некаторых сённяшніх музыкантаў гурта на той момант яшчэ не было, а сёння яны ўваходзяць у зладжаны сямейны склад аркестра.

Мерапрыемства арганізавана пасольствам Польшчы ў Беларусі і Польскім інстытутам у Мінску.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом 1703
Продавец	РУП «СМТ № 22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 48-30-01, 48-30-02, 48-30-03

Лот № 1

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Производственный корпус	4234,2 кв. м	250/D-36006

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Обременения: Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

Канализационная насосная станция ливневая (Составные части и принадлежности: подземная часть, бетонное покрытие (2833 кв. м); ограждение (панели железобетонные) длиной 193,2 м; ограждение (кирпичи) длиной 9,6 м; дороги и проезды заводской территории наружной площадью 159 кв. м (покрытие бетонное; плиты железобетонные); ворота (1/2 часть)	223,1 кв. м	250/C-34540

Адрес: Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Г, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Внеплощадочная канализационная сеть ливневая (Составные части и принадлежности: участок сети (трубопровод напорный от КНС (ливневой) до К1, колодец К1, трубопровод безнапорный от К1 до К)	785 м	250/C-39078

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, в неплощадочная канализационная сеть ливневая от КНС (ливневой) до колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6

Сеть ливневой канализации (Составные части и принадлежности:сеть ливневой канализации, в т. ч. трубопровод безнапорный, 87 колодцев, 12 дождеприемников, 25 выпусков)	2160,5 м	250/C-36840

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сеть ливневой канализации

В состав лота входит следующее оборудование:

Насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05150, насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05151, насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05152, мост. кран 16-5к-22.5-16-У3, инв. номер 02244, мост. кран 16-5к-22.5-16-У3, инв. номер 02245, электротельфер канатный 0,5 т, б/н, насос «Гном», б/н

С перечнем материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке	Для обслуживания здания канализационной насосной станции предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,6463 га

Начальная цена с НДС 20 %: 286 990,39 белорусских рублей
Шаг аукциона: **14 349,52** белорусских рублей

Порядок ознакомления по лотам № 1	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон 8 029 212-15-01

Лот № 2

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Цех деревообработки с пилорамой, сушилкой и котельной (Составные части и принадлежности: навес, пристройка (навес), котельная, дороги и проезды заводской территории наружной площадью 2936 кв. м; забор (панели железобетонные) длиной 55,8 м; забор (панели железобетонные) длиной 11,8 м; забор (кирпичи) длиной 4,1 м; забор (панели железобетонные) длиной 8,2 м)	2439,5 кв. м	250/C-34934

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с,12Б, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Вагон-бытовка (Составные части и принадлежности: терраса)	164,4 кв. м	250/C-34538

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Б/2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Дом-вагон «Нева»	164,8 кв. м	250/C-34539

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Б/3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Тепловая сеть (Составные части и принадлежности: участок тепловой сети: здания формовочного цеха, сооружений бытовых помещений (трубопровод тепловой сети от наружной стены здания котельной до наружной стены здания формовочного цеха; трубопровод тепловой сети от врезки (т. 1) до наружной стены сооружения бытового помещения производства участка № 3; трубопровод тепловой сети от наружной сети сооружения бытового помещения производства № 3 до наружной стены сооружения бытового помещения производства ПТК; участок тепловой сети от врезки (т. 2) до наружной стены сооружения бытового помещения)	236,8 м	250/C-39081

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, тепловая сеть

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв.№
Циклон бункерный	б/н – 3 единицы	Электровентилятор	б/н – 3 единицы
Котлоагрегат КВ-Т-0.5	40035	Рама лесопильная Р-63-НБ	44145
Кран мостовой 16-5К-22.5	41057	Рама лесопильная Р-63-НБ	44146
Улавливатель отходов УВП-1200	41603	Улавливатель отходов УВП-1200	41604

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Обременения	Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by
Сведения о земельном участке	Для обслуживания здания цеха деревообработки предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 1,1987 га. Ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0223 га

Начальная цена с НДС 20 %: 212 195,10 белорусских рублей
Шаг аукциона: **10 609,75** белорусских рублей

Порядок ознакомления по лоту № 2	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, контактный телефон МТС +375 29 5163223

Лот № 3

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Контрольно-пропускной пункт (Составные части и принадлежности: дороги и проезды заводской территории наружной площадью 4894 кв. м (покрытие бетонное; плиты железобетонные; плиты бетонные); ворота (1/2 часть); калитка; шлагбаум; забор (панели железобетонные) длиной 39,8 м; забор (панели железобетонные) длиной 239,6 м; забор (кирпичи) длиной 2,2 м; ворота)	18,4 кв. м	250/C-33942

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Г, в 0,3 км к востоку от д.Ксты

Мачта осветительная (инв. № 30009) (Составные части и принадлежности: мачта, арматура освещения (светильник), площадка прожекторная)	4 кв. м	250/C-39105

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, мачта осветительная

Подкрановые пути (Составные части и принадлежности: бетонная площадка под козловые краны)	175,2 м	250/C-36210

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Железнодорожные подъездные пути (Составные части и принадлежности: подъездной путь)	386,6 м	250/C-43215

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Г, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв.№
Кран козловой КК-20	41056	Вагон-бытовка	10001
Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А	07402	Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А	07408

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке	Для обслуживания здания контрольно-пропускного пункта с площадкой для хранения материалов предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 3,1766 га

Начальная цена с НДС 20 %: 58 711,19 белорусских рублей
Шаг аукциона: **2 935,56** белорусских рублей

Порядок ознакомления по лотам № 3	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, контактный телефон МТС +375 29 5163223

Лот № 4

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Элементы благоустройства (Составные части и принадлежности: покрытие бетонное, ограждение (литер Б), ворота (литер б1), калитка (литер б2))	1626 кв. м	250/C-43117

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, элементы благоустройства

Сведения о земельном участке	Для обслуживания сооружения элементов благоустройства с инвентарным номером 250/C-43117 предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,1714 га

Начальная цена с НДС 20 %: 9 070,00 белорусских рублей
Шаг аукциона: **453,50** белорусских рублей

Порядок ознакомления по лоту № 4	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон МТС +375 29 2121501

Лот № 5

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Производственный корпус (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные)	5694,7 кв. м	250/D-36976

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Кран мостовой электрический однобалочный Л-595	41070	Кран мостовой 16-5К-22,5	41071

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Обременения	Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

Начальная цена с НДС 20 %: 1 150 522,04 белорусских рублей
Шаг аукциона: **57 526,10** белорусских рублей

Лот № 6

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Производственный корпус (Составные части и принадлежности: бетоносмесительный цех, склад готовой продукции; общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные)	11371,2 кв. м	250/D-36977

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Внутриплощадочная канализационная сеть (Составные части и принадлежности: трубопровод, безнапорный, трубопровод, 45 колодцев, 4 дождеприемника, 17 выпусков)	1707,0 м	250/D-37674

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с,12, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, канализационная сеть

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Кран мостовой 16-5К-22,5	41067	Кран мостовой 16-5К-22,5	41068
Кран мостовой 16-5К-22,5	41069	Кран мостовой 16-5К-22,5	41058
Трансформаторная подстанция ТМ-1000	40036	Трансформаторная подстанция ТМ-1000	40037
Подмости шарнирно-панельные	07403	Подмости шарнирно-панельные	07404
Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (5 компл. по 2 шт.)	44102	Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (2 компл. по 3 шт.)	44106

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20 %: 2 057 088,37 белорусских рублей
Шаг аукциона: **102 854,42** белорусских рублей

Лот № 7

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Складское помещение (Составные части и принадлежности: рампа (59/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные)	970,8 кв. м	250/D-36978

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Нивелир С-330	00081	Нивелир С-330	00519
Аппарат сварочный АС-150	42017	Трансформатор ТДМ-403 У2	00482
Инвертор сварочный ZX7-160	00480	Блок снижения напряжения БСН1СУ3	00489
Насос Гном 16*16	00487		

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20 %: 93 253,79 белорусских рублей
Шаг аукциона: **4 662,69** белорусских рублей

Лот № 8

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Складское помещение (Составные части и принадлежности: рампа (41/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные)	683,5 кв. м	250/D-36979

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-4, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Начальная цена с НДС 20 %: 86 820,00 белорусских рублей
Шаг аукциона: **4 341,00** белорусских рублей

Лот № 9

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Производственное помещение (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные)	551,6 кв. м	250/D-36980

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-5, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

Обременения:	Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20 %: 66 384,39 белорусских рублей
Шаг аукциона: **3 319,22** белорусских рублей

Лот № 10

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
